*С.Ф. Іванова, А.Д. Цеплякова*
(Магілёў, Беларусь)

# НЯМЕЦКАМОЎНЫЯ ЗАПАЗЫЧАННІ КРЫЛАТЫХ СЛОЎ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Крылатыя словы, якія ўжываюцца ў той ці іншай мове, складаюцца не толькі з адзінак, што паходзяць з літаратурных ці фальклорных крыніц роднай для носьбітаў дадзенай мовы культуры. Запазычанні з іншых моў і культур – неад'емная і значная частка крылатых слоў у кожнай мове.

Пэўная колькасць іншамоўных запазычанняў крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове трапіла ў яе з нямецкай мовы [1; с. 2].

Нямецкамоўныя запазычанні крылатых слоў у беларускай мове паходзяць найперш з разнастайных уласна нямецкіх крыніц, асноўнымі з якіх з'яўляюцца наступныя.

1). Літаратурныя тэксты, якія паводле свайго зместу падзяляюца на:

а) мастацкія творы розных відаў і жанраў (празаічныя, паэтычныя, драматычныя), напр.: *чырвонай ніткай прахадзіць → sich wie ein roter Faden ziehen* (І.В. Гётэ, "Роднасныя натуры"); *загадкавая натура → eine geheimnisvolle Natur* (І.В. Гётэ, "Выслоў'і ў прозе"; выраз стаў крылатым пасля выхаду ў свет рамана Ф. Шпільгагена "Problematische Naturen"); *зорная гадзіна (часіна) → Sternstunde* (выраз з прадмовы да зборніка гістарычных навел "Зорныя гадзіны чалавецтва" С. Цвейга); *паміж молатам і кавадлам → „Hammer und Amboß"* (назва рамана Ф. Шпільгагена); *сусветная туга → Weltschmerz* (Жан-Поль Рыхтэр, "Селіна, або Пра неўміручасць душы"); *зімовая казка → Wintermärchen* (Г. Гейнэ, "Германія. Зімовая казка"); *дух часу → Geist der Zeit* (І.В. Гётэ, «Фауст»); *Спыніся імгненне! Ты цудоўнае! → Verweile doch! Du bist so schön!* (І.В. Гётэ, "Фауст") і інш.;

б) публіцыстычныя тэксты, напр.: *арыстакрат духу → Geistes Aristokratismus* (С. Ашэр, "Аб нямецкім арыстакратызме духу"); *Вайна – гэта працяг палітыкі іншымі сродкамі → Der Krieg ist die Fortsetzung der Politik mit anderen Mitteln* (К. Клаўзевіц, "Аб вайне") і інш.;

в) юрыдычныя тэксты, напр.: *з малатка → unter den Hammer* (У Германіі з XIV ст. і пазней практыкаваўся публічны продаж маёмасці, рэчаў, падчас якога, калі за тую ці іншую рэч пакупнік прапаноўваў найвышэйшую суму, ударам малатка аб'яўлялі, што рэч прададзена) і інш.;

г) філасофскія творы, напр.: *рэч у сабе → das Ding an sich* (І. Кант, "Крытыка чыстага розуму"); *пераацэнка каштоўнасцей → Umwertung aller Werte* (Ф. Ніцшэ, "Прага да ўлады"); *звышчалавек → Übermensch* (Ф. Ніцшэ, "Так казаў Заратустра") і інш;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

д) навуковыя і навукова-папулярныя тэксты, напр.: *Быццё вызначае свядомасць → Das Sein bestimmt das Bewusstsein* (К. Маркс, "Да крытыкі палітычнай эканоміі"); *радзімая пляма → Muttermal* (К. Маркс, "Крытыка Гоцкай праграмы"); *комплекс непаўнавартасці → Minderwertigkeitskomplex* (А. Адлер, "Аб непаўнавартасці органаў") і інш.

2). Назвы твораў розных відаў мастацтва (музычнага, выяўленчага і г.д.), напр.: *лятучы галандзец → „Fliegender Holländer"* (назва оперы нямецкага кампазітара Р. Вагнера); *казкі Венскага лесу → ням. „Märchen aus dem Wiener Wald"* (назва вальса аўстрыйскага кампазітара І. Штрауса) і інш.

3). Выказванні знакамітых гістарычных асоб, напр.: *шукаць учарашняга дня → den gestrigen Tag suchen* (з гістарычнага анекдота пра нямецкага курфюрста Іагана Фрыдрыха, які аднойчы сказаў: "Дзень гэты я згубіў", на што прыдворны весяльчак Клаус адказаў: "Заўтра мы ўсё добра пашукаем і абавязкова знойдзем дзень, які ты згубіў"); *каментары лішнія (не патрэбны) → Kommentar überflüssig* (выслоўе вядомага нямецкага юрыста Г. Штаўба (1856-1904), якім ён заканчваў кожнае сваё выступленне, дзе заўсёды максімальна ясна і вычарпальна выкладалася сутнасць справы); *вайна нерваў → Nervenkrieg* (выраз нямецкага фельдмаршала П. фон Гіндэнбурга (1847-1934), прэзідэнта Германіі (1925-1934), які ў інтэрв'ю карэспандэнтам аўстрыйскай газеты "Neue freie Presse" (19 лістапада 1914 г.) сказаў: "Вайна з Расіяй зараз – найперш пытанне нерваў. Калі Германія і Аўстра-Венгрыя маюць моцныя нервы і вытрымаюць, – а яны вытрымаюць, – то мы пераможам"); *месца пад сонцам → Platz an der Sonne* (выраз нямецкага дзяржаўнага дзеяча Б. фон Бюлава (1849-1929), канцлера Германіі (1900-1909), з прадмовы ў рэйхстагу 6 снежня 1897 г., прысвечанай захопу Германіяй кітайскага партовага горада Кіао-Чао: "Мы нікога не хочам заганяць у цень, але патрабуем і нашага месца пад сонцам"); *жалезная заслона → der eiserne Vorhang* (выраз з артыкула "2000 год" у часопісе "Das Reich" (23 лютага 1945 г.) нямецка-фашысцкага палітычнага і дзяржаўнага дзеяча Йозэфа Гебельса (1897-1945), у якім ён пісаў, што СССР адмежаваў сябе ад астатняга свету "жалезнай заслонай") і інш.

4). Ананімныя літаратурныя творы розных жанраў, напр.: *новы парадак → neue Ordnung* (з нямецкага перыядычнага друку 1930-х гг.) і інш.

5). Фальклорныя творы, напр.: *<жыць> на шырокую нагу → auf großem Fuß <leben>* (выраз з гістарычнага анекдота, у якім распавядаецца, што сярэдневяковая мода насіць абутак з доўгімі, вострымі, загнутымі ўверх наскамі, памеры якіх сімвалізавалі ступень знатнасці яго ўладальніка і вызначаліся спецыяльным законам, сваім узнікненнем абавязана англійскаму каралю Генрыху II Плантагенету (1133-1189), які насіў такі абутак, паколькі меў нараст на вялікім пальцы



Электронный библиотека МГУ имени А.А. Кулешова

правай нагі); *барон Мюнхаузэн → Baron Münchhausen* (герой нямецкіх ананімных апавяданняў XVIII ст., гістарычным прататыпам якога з'яўляецца барон Іеранім фон Мюнхаузэн, гановерскі юнкер) і інш.;

6). Звычаі і традыцыі нямецкага народа, напр.: *саламяная ўдава → Strohwitwe* (выраз паходзіць са старажытнага звычаю ў прырэйнскіх гарадах, калі на галаву дзяўчыны, якая мела пазашлюбнае дзіця, публічна надзявалі саламяны вянок).

Разам з тым даволі многа крылатых слоў, што прыйшлі з нямецкай мовы ў беларускую, не паходзяць з уласна нямецкіх крыніц. Гэта пераважна выразы са Св. Пісання, антычнай літаратуры, нацыянальных еўрапейскіх літаратур, фальклору народаў свету і г.д., якія ўжываюцца ў еўрапейскіх мовах і трапілі ў розныя часы ў сучасную беларускую літаратурную мову праз нямецкую [2].

У беларускай мове можна вылучыць наступныя крыніцы нямецкамоўных запазычанняў крылатых слоў няўласна нямецкага паходжання.

1). Св. Пісанне, напр.: *Адамаў яблык → Adamsapfel*; *плоць і кроў → Fleisch und Blut*; *не гледзячы на асобы → ohne Ansehen der Person* і інш.;

2). Антычная (пераважна грэчаская) міфалогія, напр.: *між (паміж) Сцылай і Харыбдай → zwischen Szylla und Charybdis*; *асядлаць Пегаса → den Pegasus satteln*; *залаты дождж → Goldregen* і інш.;

3). Нацыянальныя еўрапейскія літаратуры, напр.: *ваяваць (змагацца) з ветракамі → mit Windmühlen kämpfen* (М. дэ Сервантэс Сааведра, "Дон Кіхот"); *страляць з гарматы па вераб'ях → mit Kanonen auf Spatzen schießen* (Ж.Б. Мальер, "Школа мужоў"); *дойная карова → melkende Kuh* (Ж.Б Мальер, "Мешчанін у дваранстве") і інш.;

4). Ананімныя літаратурныя творы розных жанраў, напр.: *квадратура круга → die Quadratur des Kreises (des Zirkels)* (са старажытнай матэматычнай задачы аб пабудове з дапамогай цыркуля і лінейкі квадрата, роўнага па плошчы дадзенаму кругу; рашыць гэтую задачу спрабавалі многія пакаленні матэматыкаў, аднак толькі ў 1882 г. было канчаткова даказана, што гэта немагчыма) і інш.

5). Фальклор еўрапейскіх народаў, напр.: *калумбава яйка → das Ei des Kolumbus* (з гістарычнага анекдота пра іспанскага падарожніка Хрыстафора Калумба (1451-1506), запісанага ў кнізе "Гісторыя Новага свету" (1565) італьянскага гісторыка Дж. Бенцоні (XVI ст.); *нарадзіцца пад шчаслівай зоркай → unter einem glücklichen Stern geboren sein* (з шырока вядомай прымхі аб тым, што лёс чалавека нібыта залежыць ад таго, пад якой зоркай, паводле астролагаў, ён нарадзіўся); *ліць (праліваць) кракадзілавы слёзы → Krokodilstränen vergießen* (са старажытнага павер'я, нібыта ў кракадзіла, калі ён есць сваю ахвяру, цякуць слёзы) і інш.

6). Фальклор нееўрапейскіх народаў, напр.: *Тысяча і адна ноч → Tausendundeine Nacht* (назва зборніка арабскіх казак); *як фенікс з попелу → wie Phönix aus der Asche* (са старажытнааравійскай міфалогіі) і інш.;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7). Звычаі і традыцыі еўрапейскіх народаў, напр.: *пальма першынства → die Palme der Priorität* (ад звычаю старажытных грэкаў узнагароджваць пальмавай галінкай – сімвалам найвышэйшай славы – пераможцаў на алімпійскіх гульнях ці іншых спаборніцтвах) і інш.

Асобную групу нямецкамоўных запазычанняў крылатых слоў у беларускай мове складаюць назвы шырока вядомых гістарычных падзей, напр.: *Варфаламееўская ноч → Bartholomäuschenacht* (масавае знішчэнне гугенотаў-пратэстантаў католікамі ў Парыжы ўначы на 24 жніўня 1572 г. перад днем Святога Варфаламея) і г.д.

Нямецкамоўныя запазычанні крылатых слоў ў сучаснай беларускай літаратурнай мове як з уласна нямецкіх крыніц, так і з твораў літаратуры і фальклору іншых народаў свету патрабуюць спецыяльнага вывучэння і апісання.

**Літаратура:**


1. Крылатыя выразы ў беларускай мове: Ч. 1: З іншамоўных (еўрапейскіх і амерыканскіх) крыніц СІІ-СС стст.: Тлумачальны слоўнік / Пад рэд. Я.Я. Іванова. – Магілёў, 2004. – 136 с.
2. Лепешаў І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў. – Мінск, 2004. – 448 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова